Інга Воюш

# Рэпрэзентацыя вобраза жанчыны ў сучасным курсе літаратуры: да праблемы гендэрнага аналізу падручнікаў

Педагагічная думка бесперапынна знаходзіцца ў пошуку прагрэсіўных спосабаў адбору, падачы і інтэрпрэтацыі вучэбнага матэрыялу, якія адпавядалі б сучаснаму ўзроўню развіцця навукі, запытам вучнёўскай аўдыторыі, мелі б доступ да эмацыянальнай сферы рэцыпіента, і не выпадкова распрацоўка актуальных праблем літаратуры дае штуршок для пашырэння педагагічнага арсеналу настаўніка. Наша даследаванне будзе прысвечана праблеме маральна-эстэтычнага выхавання вучнёўскай моладзі праз культурныя тэксты, у прыватнасці, пытанню рэпрэзентацыі жаночага вобраза ў літаратуразнаўчай навуцы і, адпаведна, у мастацкіх тэкстах, прапануемых школьнымі праграмамі па беларускай літаратуры, паколькі выпускнікі педагагічны ВНУ зарыентаваны менавіта на скрупулёзнае вывучэнне твораў школьных праграм.

З вопыту вядома, што аналіз мастацкага твора ў школе не толькі мае на ўвазе літаратуразнаўчы аспект, але і нясе сур’ёзную выхаваўчую нагрузку. Задача настаўніка - выклікаць крытычна-пошукавую актыўнасць вучня, дасягнуць разам з ім высвятлення пісьменнікавай ідэі, і, як вынік, дапамагчы вызначыцца ў маральных, каштоўнасных арыенцірах. Пры гэтай умове юны чытач трывала прысвоіць набыты ў працэсе работы над творам маральна-эмацыянальны вопыт.

Калі грамадскія працэсы набываюць паскораны, супярэчлівы характар, як гэта адбываецца зараз, бачыцца неабходнай агульная кансалідацыя, наданне руху падзей канструктыўнага характару. У пошуках рашэння гэтага канфлікту грамадства з цягам часу прыйшло да ўсведамлення недаацэнкі патэнцыялу жаночага пачатку як пазітыўна актыўнага, аб’яднаўваючага, да разумення яго самакаштоўнасці, і гэта прывяло не толькі да ўзнікнення новых сацыяльна-палітычных працэсаў (стварэння партый, няўрадавых жаночых арганізацый), але і акрэсліла перад гуманітарнай навукай праблему самавыяўлення, самаідэнтыфікацыі жанчыны, сацыяльнага полу, дыферэнцыяцыі функцыянальных і марфалагічных прымет асобы жанчыны і мужчыны. Сацыялогія і феміналогія ў дадзеным кантэксце аперыруюць паняццем <u>гендэра</u> (ад англ. gender – род, пол) як сацыяльнага полу.

Акрэслім праблематыку гендэрнага вывучэння літаратуры з мэтаю вызначыцца з агульнымі накірункамі педагагічнага ўздзеяння ідэйна-тэматычнага патэнцыялу твора на маладых чытача і чытачку. Жаночае даследаванне з’яўляецца адным са складаемых гендэрных даследаванняў. Яго прынцыповае адрозненне ад традыцыйных навуковых работ у падыходзе да аб’екта вывучэння з пазіцый гендэрна маркіраванага суб’екта. Гэта акалічнасць ставіць перад даследчыкам наступныя праблемы:

1. Прысутнасць жанчыны-даследчыка ў навуковым дыскурсе ў якасці паўнацэннага інфарманта.
2. Пераход ад уключанасці ў маскулінныя кагнітыўныя практыкі да іх гендэрнай рэфлексіі.
3. Рэпрэзентацыя спосабу жаночага быцця ў свеце як “іншага”.

Для прыватнага літаратуразнаўчага даследавання вышэй згаданыя праблемы канкрэтызуюцца ў наступныя аспекты рэпрэзентацыі жанчыны ў культурным тэксце і кантэксце :

1. Раскрыццё ролі жанчыны як суб’екта літаратурнай творчасці:

а) феномен жаночага аўтарства;
б) ego-дакументы і жанр жаночай аўтабіяграфіі;
в) паняцці жаночай літаратуры, тэксту, пісьма;
г) артыкуляцыя жаночага вопыту.

2. Вывучэнне рэпрэзентацыі вобраза жанчыны як аб’екта літаратурнай творчасці:

а) праблема маніфестацыі жаночага ідэала, паняцце партыярхатнага кода;
б) сям’я як гендэраўтваральная мадэль у літаратурным тэксце;
в) семантыка жаночага вобраза;
г) трансфармацыя жаночага вобраза.

3. Распрацоўку метадаў гендэрна адэкватнага аналізу мастацкіх тэкстаў:

а) гінакрытыка і жаночае/альтэрнатыўнае прачытанне;
б) тыпы тэкстуальнай практыкі;
в) адрасацыя вытворчасці мастацкай рэальнасці;
г) экстралітаратурныя параметры ;
д) элементы міждысцыплінарнага даследавання;
е) аналіз моўнай рэпрэзентацыі.

Калі пытанні аб ролі жанчыны як суб’екта літаратурнай творчасці (1.) і аналізу мастацкіх тэкстаў (3.) тычацца ў большай ступені тэарэтычных бакоў літаратуразнаўства – праблем псіхалогіі творчасці і метадалогіі тэкстуальнага аналізу, то элемент

рэпрэзентацыі і маніфестацыі вобраза жанчыны (2.) можа мець практычны выхад у плынь стратэгіі выхавання: маральна-эстэтычны ідэал жанчыны, закладзены ў тэкстах для чытання, уплывае на светапоглядныя характарыстыкі рэцыпіента – і разумнае кіраванне гэтым працэсам адкрывае дадатковыя магчымасці ў мадэляванні адэкватных сцэнарыяў яго развіцця.

Паколькі гендэр – сацыяльны пол, у літаратуры біялагічны "пол аўтара і тэкстуальная практыка (тып творчасці – *І. В.*) могуць не супадаць" (Сандра Гілберт, Сюзан Губар (2, с. 549)), элементарныя прыклады чаго мы можам назіраць у неадпаведнасці полу пісьменніка і яго лірычнага героя або псеўданіма (напрыклад, вядомыя псеўданімы Цёткі – Банадысь Асака, Мацей Крапіўка, Гаўрыла з Полацка, Максіма Багдановіча -- Ек. Февралёва і інш.; героі У. Караткевіча – маці Урагану, Янкі Купалы – "калгасніца маладая" і г. д.).

Тым не менш, абсалютная большасць аўтараў прадстаўляюць тып творчасці, а значыць, адлюстравання свету, адпаведны полу. У метадычным плане гэта можа азначаць, што па колькасці прапануемых школьнікам твораў аўтараў мужчын або жанчын можна меркаваць, якая ўстаноўка на ўспрыманне рэчаіснасці даецца вучням праграмай, падручнікам, як гэта ўплывае на полавую самаідэнтыфікацыю. Вядома, мастацтва як катэгорыя вечная не мае полу, але малады чытач, для якога не толькі змест, але і палёт, і спосаб думкі пісьменніка могуць стаць узорнымі, пол мае. Зразумела, дзяўчынкі і хлопчыкі ўспрымаюць адзін і той жа тэкст, праблему, канфлікт па-рознаму, значыць, усё ж такі бясполавага аўтара, як і чытача, рабіць аб'ектам вывучэння навукова некарэктна.

Патрыярхатна закадаваныя тэксты на падсвядомым узроўні апелююць і да хлопчыкаў, і да дзяўчынак, праектуючы адпаведныя мадэлі паводзін і ўстаноўкі:

1. Жанчына – аб'ект сацыяльнай практыкі, якая пазбаўляе яе характарыстычных рыс (Кузьма Чорны "Трэцяе пакаленне" (Зося), Іван Шамякін "Трывожнае шчасце" (Саша Траянава), "Гандлярка і паэт" (гандлярка), Міхась Зарэцкі "Дзіўная" (маці-адзіночка)). Мужчына – стваральнік сацыяльных практык.
2. Жанчына – аб'ект жадання (Янка Купала "Бандароўна" (Бандароўна), "Яна і я" (Яна), Кузьма Чорны "Вераснёвыя ночы" (Агата), Максім Танк "Ave Марыя" (манашка), Леанід Дранько-Майсюк - лірыка, Генрых Далідовіч "Жар кахання", Уладзімір Караткевіч "Каласы пад сярпом тваім" (Гелена)). Мужчына – суб'ект жадання.
3. Жанчына – аб'ект высокіх пачуццяў, якія характарызуюць галоўнага героя (Якуб Колас "У палескай глушы" (Ядвіся), Уладзімір Караткевіч "Чазенія" (Гражына), "Дзікае паляванне караля Стаха" (Надзея), Кастусь Каліноўскі "Марыська чарнаброва...", Ніл Гілевіч "Родныя дзеці" (Альжбета), Алесь Жук "Праклятая любоў" (Галіна)). Мужчына – галоўны персанаж, стваральнік мастацкага дзеяння.
4. Жанчына – пасіўны аб'ект спагады і шкадавання, ахвяра (Францішак Багушэвіч "Тралялёначка" (пані Тралялёначка), Эліза Ажэшка "Нізіны" (Хрысціна), Ядвігін Ш. "Бярозка" (нявестка), Цётка "Зялёнка" (студэнтка), Гарэцкі "Літоўскі хутарок" (дочкі гаспадара), Змітрок Бядуля "На каляды к сыну" (маці), Васіль Быкаў "Альпійская балада" (Джулія), "Пакахай мяне, салдацік" (Франя), Пятрусь Броўка "Голас сэрца" (маці), Іван Мележ "Палеская хроніка" (Хадоська)). Мужчына – абаронца, актыўны і здольны да дзеяння суб'ект.
5. Жанчына – сімвал: Беларусь, Радзіма, Муза, Смерць. (Ян Баршчэўскі "Шляхціц Завальня..." (Плачка), Янка Купала "Тутэйшыя", "Босыя на вогнішчы" (Маладая Беларусь, маці), Якуб Колас "Сымон-музыка" (Ганула), Уладзімір Караткевіч "Ладдзя Роспачы" (Смерць), Аляксей Дудараў "Злом" (Русалка), Максім Гарэцкі "Дзве душы" (маці)). Мужчына – аўтар-стваральнік сімвала.
6. Жанчына – сасуд распусты і заган, часта вельмі прывабны знешне (Кандрат Крапіва "Брама неўміручасці" (Наташа), Андрэй Мрый "Гармонія ў ружовым", Эліза Ажэшка "Хам" (Франка), Вячаслаў Адамчык "Чужая бацькаўшчына" (Алеся), Васіль Быкаў "Сцюжа" (Паліна), Віктар Казько "Выратуй і памілуй нас, чорны бусел" (Дзева Марыя)). Мужчына – ахвяра падманлівай прыгажосці.
7. Жанчына – суб'ект перажыванняў ("жаночая" лірыка -Канстанцыя Буйла, Наталля Арсеннева, Яўгенія Янішчыц, Данута Бічэль-Загнетава, Людміла Урублеўская, Ірына Багдановіч). Мужчына – аб'ект перажывання.
8. Жанчына – суб'ект, здольны прымаць рашэнні (Ларыса Геніюш "Споведзь" (галоўная гераіня), Васіль Быкаў "Знак бяды" (Сцепаніда), Уладзімір Караткевіч "Нельга забыць" (Ірына), Іван Мележ "Палеская хроніка"

(Ганна), Адам Міцкевіч "Гражына" (княгіня), Таіса Бондар "Спакуса" (Ефрасіння Полацкая)). Мужчына – мае патрэбу ў духоўнай падтрымцы.

Бачна, што роля пасіўнага аб'екта ў большасці выпадкаў належыць жанчыне, актыўнага суб'екта – мужчыну, прычым пераадоленне гэтага стандарта звязана або з творамі, дзе аўтарамі з'яўляюцца жанчыны, або з тэкстамі, дзе жанчыне належыць негатыўная роля. У маральным плане гэта можа азначаць, што хлопчыкі, "прымяраючы" на сябе тып паводзін персанажаў-мужчын, атрымліваюць устаноўку прымаць рашэнні, весці рэй, несці адказнасць, а дзяўчынкі – прымаць наступствы гэтых рашэнняў, саступаць у лідэрстве, падзяляць адказнасць. Магчыма, такі "сімбіёз" выглядае лагічна, але ў такім выпадку мы вяртаемся да чыста маральных праблем "анямлення" жанчыны, да трывіяльнай спрэчкі аб людзях першага і іншых гатункаў.

Зразумела, што аб'ектыўнае адлюстраванне літаратурнага працэсу нават у колькасных характарыстыках – гэта пытанне дыдактычнага прынцыпа навуковасці (не будзем тут спыняцца на пытанні, чаму жанчын-аўтараў да другой паловы XX ст. было катастрафічна мала), але фарміраванне якой асобы дзяўчынкі, дзяўчыны-падлетка праектуецца існуючымі праграмамі?

Прааналізуем на прадмет наяўнасці жанчын-аўтараў шасцітомны біябібліяграфічны слоўнік "Беларускія пісьменнікі". З прыкладна 1170 прозвішчаў 136 належаць жанчынам, з іх пісьменніцам і паэтэсам – 95. Іншымі словамі, атрымліваем, што сярод беларускіх творцаў толькі 8% жанчын. У падручніках па літаратуры гэта адлюстравана адпаведна. Паколькі хрэстаматыя складаецца ў адпаведнасці з падручнікам, для зручнасці зробім выбарку па вучэбных кнігах "Родная літаратура".

| №п/п | Назва падручніка | Клас | Месца і год выдання | Усяго аўтараў | Жанчын | Жанчын у працэнтах |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Родная літаратура / Цітова Л.К. | 5 | Мн., 1994 | 31 | 3 | 10% |
| 2. | Родная літаратура / Ішчанка Г. | 5 | Мн., 1995 | 33 | 4 | 12% |
| 3. | Лазарук М. А. Родная літаратура | 6 | Мн., 1998 | 43 | 3 | 7% |
| 4. | Родная літаратура / Асташонак Л. В. | 6 | Мн., 1999 | 32 | 2 | 6% |
| 5. | Родная літаратура / Ляшук В.Я. | 7 | Мн., 1995 | 19 | 0 | -- |
| 6. | Родная літаратура / Лазарук М. А. | 7 | Мн., 2001 | 32 | 2 | 6% |
| 7. | Родная літаратура / Ляшук В.Я. | 8 | Мн., 1995 | 23 | 2 | 9% |
| 8. | Родная літаратура / Кушнярэвіч В. В. | 8 | Мн., 1996 | 15 | 1 | 7% |
| 9. | Родная літаратура / Гарадко Г. С. | 9 | Мн., 2000 | 25 | 3 | 12% |
| 10. | Родная літаратура / Дзіско У. А. | 9 | Мн., 1996 | 19 | 0 | -- |
| 11. | Родная літаратура / Асташонак Л. В. | 10 | Мн., 1997 | 36 | 2 | 5% |
| 12. | Родная літаратура / Лазарук М. А. | 10 | Мн., 1997 | 12 | 1 | 8% |
| 13. | Родная літаратура / Асташонак Л. В. | 11 | Мн., 1999 | 54 | 9 | 17% |
| 14. | Родная літаратура / Мішчанчук М. І. | 11 | Мн., 2000 | 16 | 0 | -- |

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў сярэднім працэнт аўтараў-жанчын у падручніках для сярэдняй і старэйшай школы складае прыблізна 7%.

Зважаючы на гэта, хацелася б прыцягнуць увагу метадыстаў і выпускнікоў-філолагаў да праблем:

- адказнага стаўлення да зместу і аўтарства ў літаратурнай адукацыі моладзі;
- гендэрна карэктнай прэзентацыі вобраза жанчыны ў падручніках і хрэстаматыях па літаратуры;
- фарміравання асобаснай матывацыі дзяўчыны, жанчыны да самаактуалізацыі ў грамадстве XXI ст.;
- усведамлення маральных установак твораў літаратуры для юнака, мужчыны і магчымага ўзнікнення ў яго дамінантнага светаадчування.

**Літаратура**

1) Беларускія пісьменнікі: Біябібліягр. слоўн. У 6 т. Энцыкл. Т. 1 – 6. – 1992 – 1995.
2) Введение в гендерные исследования. Ч.1 / Под. ред. И. А. Жеребкиной. – Харьков-СПб, 2001.
3) Лазарук М. А. Родная літаратура, 6. -- Мн., 1998.
4) Родная літаратура / Цітова Л.К., 5. -- Мн., 1994.
5) Родная літаратура / Ішчанка Г., 5. -- Мн., 1995.
6) Родная літаратура / Асташонак Л. В., 6. -- Мн., 1999.
7) Родная літаратура / Ляшук В.Я., 7. -- Мн., 1995.
8) Родная літаратура / Лазарук М. А., 7. -- Мн., 2001.
9) Родная літаратура / Ляшук В.Я., 8. -- Мн., 1995.
10) Родная літаратура / Кушнярэвіч В. В., 8. -- Мн., 1996.
11) Родная літаратура / Гарадко Г. С., 9. -- Мн., 2000.
12) Родная літаратура / Дзіско У. А., 9. -- Мн., 1996.
13) Родная літаратура / Асташонак Л. В., 10. -- Мн., 1997.
14) Родная літаратура / Лазарук М. А., 10. -- Мн., 1997.
15) Родная літаратура / Асташонак Л. В., 11. -- Мн., 1999.
16) Родная літаратура / Мішчанчук М. І., 11. -- Мн., 2000.
17) Фарман И. П. Теория познания и философия культуры. – М., 1986.